

# «СЁННЯ ТРЭБА ДЗЕНЬ І НОЧ ПРАЦАВАЦЬ»

**Якія задачы для эканомікі краіны на наступны год паставіў Прэзідэнт**

(Стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 201 (30589)

Новы праект у сферы медыцыны рэалізуюць вучоныя Беларусі і Расіі. Праграма «Саюз-Біямембраны» прадугледжвае распрацоўку фармакалагічна актыўных злучэнняў, тэхналогій клетачнай тэрапіі і метадаў ідэнтыфікацыі тэрапеўтычна значных мішэняў для лячэння анкалагічных, аўтаімунных, сардэчна-сасудзістых, інфекцыйных і нейрадэгенератыўных захворванняў. Гэта прататыпы інавацыйных лекаў для барацьбы з невылечнымі сёння хваробамі.

СТАР. 8–9



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# РАСПРАЦОЎКІ ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ

**Вучоныя Беларусі і Расіі ствараюць прататыпы інавацыйных лекаў**



З ПЕРШЫХ ХВІЛІН — У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ 8–9

МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД

АКЦЭНТЫ «ЛІСТАПАДА-2025» 15



+TV ПРАГРАМА

«ЗАКАХАНЫ ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ»

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале **@zviazdaby**. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# «КВАДРАТ» З ПАДТРЫМКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Штогод паляпшаюць свае жыллёвыя ўмовы звыш 25 тысяч сем'яў**

Сёлета завяршаецца рэалізацыя пяцігадовай Дзяржаўнай праграмы «Будаўніцтва жылля». Паводле звестак Мінбудархітэктуры, за апошнія чатыры гады пабудавана 17,2 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылля, у тым ліку 4,6 мільёна «квадратаў» з дзяржпадтрымкай. У нашай краіне штогод паляпшаюць свае жыллёвыя ўмовы ў сярэднім звыш 25 тысяч сем'яў.

СТАР. 6–7



ISSN 1990 — 763X

# «СЁННЯ ТРЭБА ДЗЕНЬ

## Якія задачы для эканомікі краіны



На парадку дня Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — праекты дакументаў па сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, прагноз работы эканомікі і бюджэт на 2026 год. Кіраўнік дзяржавы сабраў нараду аб праектах прагнозных дакументаў на 2026 год.

### КАРЦІНА НЕАДНАЗНАЧНАЯ

Прэзідэнт нагадаў аб завяршэнні рэалізацыі шостай пяцігадовай праграмы. Ён арыентуе, што ў тыя некалькі месяцаў, што засталіся да канца года, трэба прыкласці неймаверныя намаганні для выканання ўсіх даведзеных параметраў. Пакуль жа, па словах Аляксандра Лукашэнкі, карціна ў эканоміцы неадназначная. «З аднаго боку, ёсць відавочны вынік: стабільна растуць рэальны заробак і агульныя даходы насельніцтва. Двойчы сёлета ўдалося падняць пенсіі. У нас моцная нацыянальная валюта. Рэкордна павялічваюцца золатавалютныя рэзервы, — адзначыў ён. — З другога боку, ёсць бягучы спад у шэрагу традыцыйных галін. Тры з пяці найважнейшых параметраў прагнозу на гэты год не выконваюцца. Валавы ўнутраны прадукт павялічыўся менш, чым на 2 % за восем месяцаў».

### Кіраўнік дзяржавы пазначыў прынцыповыя пытанні па асобных галінах

**Аграрны сектар.** «Нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, змаглі ўбраць нядрэнны ўраджай. Але па тэмпах росту ў сельскай гаспадарцы не ўдалося наблізіцца да ўзроўню мінулага года, пакуль менш за 100 %, няхай на 1 %, але менш», — адзначыў Прэзідэнт.

> **Пры гэтым ён выказаў упэўненасць, што паказчык у 100 % атрымаецца перайсці. «Ясна, што ссунуліся тэрміны вегетацыі ў раслінаводстве і, натуральна, уборкі ўраджаю», — заўважыў беларускі лідар. Па сітуацыі ў галіне пастаўленыя персанальныя задачы ўсім адказным асобам. «Пры гэтым хачу папярэдзіць: любое, найменшае невыкананне не толькі маіх даручэнняў, а і нашых дамоўленасцяў і рашэнняў, будзе карацца самым жорсткім чынам. А то мы сёння збіраемся ўсюды на ўсіх узроўнях і крычым аб тэхналагічнай і працоўнай дысцыпліне. А самі?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

**Прамысловасць.** Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што яна прасядае — 99,2 %. «Больш за тое, пагаршэнне дынамікі яе работы назіраецца, пачынаючы з першага квартала (у сярэднім штомесяц на паўпрацэнта)», — працягнуў ён.

**Экспарт тавараў.** Тэмп продажаў у апошнія месяцы застыў на ўзроўні 97 %. Гэта значыць, недаатрымана мінімум каля 650 мільёнаў долараў. «І губляем там, дзе, здавалася б, павінны зарабляць, — на нашых флагманскіх таварах: трактары, аўтамабілі, камбайны, фарбы, шыны, сметанковае масла, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Выробленая прадукцыя асядае на складах, узровень запасаў пяты месяц не апускаецца ніжэй за 80 %. Як вынік, маем устойліва адмоўнае сальда знешняга

## Даслоўна

### ДЛЯ ДАСЯГНЕННЯ ЗАПЛАНАВАНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ

Размаўляючы з журналістамі, **Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын** выказаў перакананасць, што рост эканомікі ў цэлым павінен быць устойлівым і збалансаваным на доўгатэрміновы перыяд. «Вельмі важна знайсці збалансаваны падыход, каб, з аднаго боку, забяспечыць рост эканомікі, а з другога — не дапускаць у ёй дысбалансу. Каб усе паказчыкі паміж сабой былі ўзаемазвязаны. А самы галоўны вынік — гэта далейшае павышэнне ўзроўню жыцця нашых грамадзян», — сказаў ён, зрабіўшы акцэнт на тым, што гэта важна і з улікам няпростых знешніх умоў, ды і санкцыйны ціск нікуды не падзеўся.

Кіраўнік урада назваў лічбы і паказчыкі, якія разглядаліся на нарадзе ў Прэзідэнта, напружанымі. Па яго словах, для выканання гэтых паказчыкаў неабходна будзе прыкласці максімум намаганняў. На нарадзе было адзначана, што ў 2026 годзе чакаецца рост экспарту на 3,7 %. Павелічэнне гэтага паказчыка плануецца забяспечыць за кошт пашырэння паставак у краіны далёкай дугі і СНД пры захаванні пазіцый на рынку Расіі. Плануецца павялічыць пастаўкі беларускай прадукцыі ў Кітай, краіны Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Для рэалізацыі намечаных планаў у бліжэйшы час урад плануе прыняць пастанову, у якой вызначыць персанальныя задачы паслам і кіраўнікам прадпрыемстваў па рэалізацыі нашай прадукцыі ў краінах знаходжання.

«Значную частку росту нашага ВУП забяспечвае экспарт. Сёння гэта адна з першачарговых задач, і яна будзе персаніфікаваная не толькі для кожнага чыноўніка, але і для кожнага кіраўніка прадпрыемства і замежнай установы. Яны павінны дакладна і ясна разумець, што, у якіх аб'ёмах і на рынках якіх краін мы павінны абавязкова ў наступным годзе прадаць», — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Рост ВУП у 2026 годзе запланаваны на 2,8 %, рост рэальных грашовых даходаў насельніцтва — на 4,8 %. Што тычыцца такога паказчыка, як інфляцыя, то Нацбанк сумесна з урадам плануе яе на ўзроўні да 7 %. Плануецца, што інвестыцыі ў эканоміку ў наступным годзе вырастуць на 3,1 %. Сярод кірункаў інвеставання — рэалізацыя інвестыцыйных праектаў, стварэнне і развіццё інфраструктуры ў рэгіёнах, будаўніцтва жылля і іншыя.

* * *

**Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Раман Галоўчанка** адзначыў, што асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, якія закладзены ў адпаведным праекце ўказа кіраўніка дзяржавы, могуць паказацца на першы погляд недастаткова напружанымі, таму што арыфметычна меншыя, чым тыя, што былі ў мінулыя гады. «Але на тое ёсць свае прычыны. Гэта і складаная міжнародная абстаноўка, гандлёвыя войны, даволі істотнае астуджэнне расійскай эканомікі, нашага асноўнага гандлёвага партнёра. На гэтым фоне задачы выглядаюць досыць напружанымі, — патлумачыў кіраўнік Нацбанка. — І нам не трэба самім сабе тлумачыць, што сітуацыя складаная, таму мы будзем трохі больш стрыманымі ў дасягненні нашых мэт. Прэзідэнт правільна сказаў, што свет вялікі і трэба працаваць напружана — і на расійскім рынку, і больш актыўна выходзіць на іншыя рынкі».

Па словах Рамана Галоўчанкі, прыйдзецца сур'ёзна «папацець», каб выканаць пастаўленыя задачы, нават калі яны, можа быць, здаюцца не такімі вялікімі. «Але ў прынцыпе яны не меншыя, чым тэмпы росту эканомік самых развітых краін», — сказаў кіраўнік Нацбанка. Пры гэтым, паводле яго слоў, ёсць рэзервы для выхаду на больш высокія пазіцыі. «Нам трэба сур'ёзна павялічваць аб'ём інвестыцый у вытворчую сферу, у камерцыйныя праекты, якія дадуць нам сур'ёзны прыток дабаўленай

# І НОЧ ПРАЦАВАЦЬ»

## на наступны год паставіў Прэзідэнт

гандлю. Нягледзячы на рост інвестыцый, іх аб'ём пакуль далёкі нават ад простага падтрымання канкурэнтаздольнасці эканомікі, каля 19 % ВУП».

Аляксандр Лукашэнка анансаваў, што праз два тыдні на пашыраным пасяджэнні з апаратам урада і запрошанымі бягучыя вынікі работы эканомікі будуць абмеркаваны больш падрабязна.

### «Я НЕ МАГУ РАЗВАЖАЦЬ АБ МАКРАМАТЭРЫЯХ, КАЛІ ЗА ПЛОТАМ ПАЛАЕ ВАЙНА»

«Галоўнае — я хачу ўбачыць, якім чынам мы ў прынцыпе арганізавалі работу так званай «мабілізацыйнай эканомікі» (У СМІ часта гучыць гэты тэрмін і правільна гучыць). Прычым на канкрэтных прыкладах, без вады і агульных разваг аб «кіраваным аступленні з расійскага рынку» як аб галоўнай прычыне нашых цяжкасцяў», — пазначыў яшчэ адно пытанне Прэзідэнт. Ён адзначыў, што за экспартам замацаваныя віцэ-прэм'еры з канкрэтнымі прозвішчамі. «Як з іх і міністра замежных спраў пытаецца Прэм'ер-міністр і яго прэзідыум?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы.

Другі ўзровень — работа галіновых міністраў і нашых пасольстваў у ключавых краінах, якіх кіраўнік дзяржавы арыентуе найперш на гандаль і інвестпраекты. «Далей — дырэктары прадпрыемстваў і іх маркетынгавыя службы. Паўтараю: выразная вертыкаль і сістэма. Ёсць яна ці не? Ёсць. Працуе?» — працягнуў беларускі лідар. Ён таксама згадаў пра такія фактары, як алічбоўка заданняў і кантроль.

«Я не магу разважаць пра макраматэрыі, калі за адным плотам ужо палае вайна, за другім — да яе ляцаць на ўсіх парах. А вы сметанковае масла з трактарамі і камбайнамі прадаць не можаце. Параю вам: вылазьце, пакуль не позна, са сваіх цёплых крэслаў, аўтамабіляў і пачынайце глядзець далей, значна далей, чым наш традыцыйны расійскі рынак, — заявіў Прэзідэнт.

— Пакуль поспехі, калі адкінуць сыравінныя тавары, вельмі сціплыя: ад Кітая да Аргенціны. Увогуле, хутка вывучым, як наша ўрадавая вертыкаль займаецца ўстойлівым развіццём эканомікі. Паўтараю: да канца года яшчэ цэлы квартал. І спыніце стогны, што ўрад новы і працуе нібыта няпоўны год, таму, быццам бы, гэта не вашы прамашкі і касякі. А чые? Пра гэта і казаць не трэба. Гэта проста несалідна ў цяперашняй абстаноўцы і скажу: гэта не па-мужчынску».

### ПАТРЭБНЫ РЭАЛІСТЫЧНЫ, АЛЕ НАПРУЖАНЫ СЦЭНАРЫЙ

Што датычыцца прагнозных паказчыкаў на 2026 год, па словах кіраўніка дзяржавы, патрэбны рэалістычны, але напружаны



сцэнарый. «Яшчэ раз падкрэсліваю: рэалістычны і напружаны», — зрабіў акцэнт ён. Аляксандр Лукашэнка не выключае таго, што хтосьці можа прапанаваць тэмпы, вышэйшыя за ацэначны рост у 2,8 %.

**«Хтосьці прапануе тры, тры з паловай працэнта — калі ласка. Дзе, за кошт чаго і як сам упражэцца ў павышэнне гэтай дынамікі. Калі хтосьці ніжэйшыя — няхай растлумачыць, як гэта будзе ўспрынята нашым грамадствам і як будзе жыць Беларусь. А не проста ўстаць і сказаць: «Вось, цяпер мала плануем, трэба больш». За кошт чаго?» — заўважыў кіраўнік дзяржавы.**

Ён пацікавіўся, што канкрэтна было ўзята за аснову росту эканомікі, які ўрад ацэньвае на ўзроўні 102,8 %.

### ТРЭБА ЎЗМАЦНІЦЬ РАБОТУ ПА АСНОЎНЫХ РЫНКАХ

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што расійская эканоміка звужаецца, і наогул не ўлічваць бягучую сітуацыю нельга, 67 % нашага экспарту і 56 % імпарту — гэта Расія.

**«Значыць, тым больш нам патрэбны падрабязныя алічбаваныя таварныя планы (матрыцы): што і ў якіх аб'ёмах вырабляем, куды прадаём і колькі валюты прывязём у краіну», — паставіў задачу Прэзідэнт.**

Ён нагадаў, што перад кожнай службовай асобай, вызначанай урадам адказнай, павінна ляжаць шпаргалка: куды і колькі завязе трактароў, камбайнаў і сметанковага масла.

**Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што трэба больш строга спытаць за эфектыўную работу ў Казахстане, Узбекістане, Азербайджане — там немалы рынак, на якім нас чакаюць. Пры гэтым важна не забываць, што беларускі рынак — гэта святое, арыентуе беларускі лідар.**

Ён ухваліў выказванне Аляксандра Турчына аб дастатковым забеспячэнні ўнутранага рынку нафтапрадуктамі. «Ты правільна ўчора сказаў у інтэрв'ю — ні ў якім разе не пакрыўдзіць беларусаў. Рынак Беларусі — гэта святое», — сказаў Прэзідэнт і ў сувязі з гэтым выказаўся на злабадзённую тэму. Цяпер на ўзровень кіраўніка дзяржавы паступае інфармацыя аб скаргах людзей на чэргі на АЗС. І ўзнікаюць яны не таму што ўнутраны рынак у дастатковым аб'ёме не забяспечваецца палівам, а таму што АЗС ператвараюцца ў кафэ. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час людзі літаральна патрабавалі, каб на кожнай запраўцы былі спадарожныя тавары і магчымасць, напрыклад, папіць кавы.

«Вы што там, з глузду з'ехалі? Вы прасілі? Прасілі. Я прыняў рашэнне: на кожнай запраўцы павінны быць спадарожныя тавары і кава. «Сёння не можам пад'ехаць, заправіцца, таму што не там аўтамабілі стаяць...» — працытаваў ён сутнасць наракання. Прэзідэнт папрасіў Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі даручыць кіраўніку МУС да панядзелка навесці парадак у гэтым пытанні.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

## ПРЫЙДЗЕЦЦА «ПАПАЦЕЦЬ»

вартасці», — дадаў Раман Галоўчанка. На гэта нацэлена работа групы па дапрацоўцы праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку. «Ёсць два пытанні, над якім трэба будзе сур'ёзна папрацаваць. Па—першае, трэба павышаць навукаёмістасць прадукцыі, гэта значыць усе — ад дзяржавы да невялікіх фірм — павінны актыўна інвеставаць у інавацыі, усе павінны быць інавацыйна актыўнымі. Калі не хочам быць пастаянна даганяючай эканомікай, нам трэба павышаць інавацыйнасць і трэба павышаць выдаткі на даследаванні і распрацоўкі, у тым ліку на камерцыйных прадпрыемствах. Па-другое, трэба ў цэлым павялічваць інвестыцыі ў камерцыйны сектар, каб яны давалі большы аб'ём дабаўленай вартасці, чым ёсць цяпер. Гэта адзін з ключавых і прынцыповых момантаў для развіцця нашай краіны. Я бачу гэта адным з прыярытэтаў для нас на найбліжэйшую эканамічную будучыню», — рэзюмаваў Раман Галоўчанка.

***

**Міністр па падатках і зборах Дзмітрый Кійко** заявіў, што падатковае заканадаўства краіны ўжо адбылося, але з кожным годам разам з бюджэтным пакетам яно актуалізуецца. «Сістэмна, структурна нічога не мяняецца. Ёсць некалькі традыцыйных блокаў, якія рэалізуюцца штогод. Гэта індэксацыя ставак падаткаў, якія ўстаноўлены ў беларускіх рублях, каб адаптаваць іх да інфляцыйных працэсаў. Асобны блок накіраваны на павышэнне справядлівасці падаткаабкладання. Дыскусійнае пытанне ў дачыненні да павышэння стаўкі падаходнага падатку, але дыялог па гэтым пытанні будзе працягнуты ў парламенце. Ёсць блок, які ўдасканальвае падатковыя льготы: з аднаго боку, адмяняецца частка падатковых ільгот, якія аказваюцца неэфектыўнымі і незапатрабаванымі, з другога боку, прапануюцца льготы стымулюючага характару. Ёсць прапановы па ўдасканаленні работы падатковых органаў», — распавёў Дзмітрый Кійко.

Журналісты асобна ўдакладнілі пра павышэнне стаўкі падаходнага падатку. Міністр патлумачыў, што гэта прапанова па павышэнні справядлівасці падаткаабкладання называецца прагрэсіўнае падаткаабкладанне. «Чым большы ў цябе ўзровень даходу, тым больш табе прапануецца заплаціць стаўку. Гэта наогул стандартная сітуацыя ў еўрапейскіх краінах для такіх падатковых сістэм. У нас ужо часткова рэалізаваная гэтая сістэма. Мы з 2024 года павысілі стаўку падаходнага падатку: ужываецца 25 % для даходаў звыш 200 тысяч беларускіх рублёў. Мы ўжо атрымалі першыя вынікі гэтай работы», — адзначыў Дзмітрый Кійко. Ён звярнуў увагу, што гэта не датычыцца абсалютнай большасці грамадзян, якія атрымліваюць даходы ў выглядзе заработнай платы. Калі ўзяць наша працаздольнае насельніцтва — гэта больш за 4 млн чалавек, — то павышаная стаўка закранула крыху менш за 8 тысяч чалавек. А ў выніку ў даходы мясцовых бюджэтаў паступіла каля 200 мільёнаў рублёў.

«Узнікла пытанне аб тым, каб разгледзець магчымасць увядзення і трэцяй стаўкі для яшчэ больш забяспечанай групы грамадзян. На сёння мы ацэньваем іх колькасць прыблізна ў адну тысячу чалавек. Тут галоўнае не перагнуць палку. Гэта як прапанова мае права на жыццё. Тым не менш па выніках абмеркавання вырашана працягнуць гэтую дыскусію ў парламенце. Таму, я думаю, пра падрабязнасці мы будзем гаварыць, калі дакументы непасрэдна паступяць у парламент і там пачнецца канкрэтнае абмеркаванне», — дадаў Дзмітрый Кійко.

# «СЁННЯ ТРЭБА ДЗЕНЬ І НОЧ ПРАЦАВАЦЬ»

«Трэба ўзмацніць работу па асноўных нашых рынках. Нядаўна Прэзідэнт Расіі прывёў прыклад: наш двухбаковы тавараабарот вышэйшы, чым сумарны Расійскай Федэрацыі з усімі краінамі СНД разам узятымі. Прыемны факт. Ды хіба і для нас гэта не сігнал ісці на дадзеныя рынкі, дзе з часоў СССР ужо ў разы вырасла колькасць насельніцтва і ёсць велізарная патрэба ва ўсім — ад прадуктаў харчавання да прамысловых тавараў?» — абазначыў поле дзейнасці Аляксандр Лукашэнка. У прыклад ён прывёў Узбекістан, дзе з кожным годам прырастае насельніцтва, адпаведна, расце попыт на прадукты харчавання, якія мы можам пастаўляць. Аналагічная сітуацыя з Казахстанам — вялікая тэрыторыя, шмат насельніцтва і ўсё трэба. «Але папярэджваю — якасць.

**У нас ёсць магчымасці рабіць якасны тавар», — нагадаў сваё нязменнае патрабаванне Прэзідэнт.**

## ПЛАНЫ – ПАД КАНКРЭТНЫ ВЫНІК

«Наколькі ўвязаныя і збалансаваныя паміж сабой эканамічныя планы з бюджэтнымі? З матэрыялаў вынікае, што Мінфінам распрацаваны няхай і не крытычны, але дэфіцытны бюджэт. А ў нас наперадзе сур'ёзныя выплаты па дзяржаўным доўгу (2026 год — адзін з пікавых перыядаў). Ёсць крыніцы для яго пакрыцця? Будуць пры гэтым паўнавартасна і ў тэрмін выкананыя ўсе сацыяльныя абавязацельствы?» — пазначыў яшчэ адзін момант кіраўнік дзяржавы. У наступным годзе пачынаюць дзейнічаць новыя дзяржаўныя праграмы. Урад ужо сфарміраваў іх пералік, які будзе разгледжаны асобна. Большасць — сацыяльна-эканамічнай накіраванасці і фінансуюцца з бюджэтаў.

«Але што ў аснове гэтых праграм? Як вызначалася патрэба ў рэсурсах? Гэта павінны быць рэальныя, прыдатныя на практыцы планы пад канкрэтны і эфектыўны вынік!» — арыентуе Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на адзін момант, які даручана выканаць, і Прэм'ер-міністру:

**«Ні ў якім разе не займацца будаўніцтвам і стварэннем таго, без чаго сёння і заўтра можна абысціся. Гляджу, гэтыя офісы, палацы на месцах, яшчэ нешта. «Трэба будаваць!» — І ў праграму. Слухайце, кароўнікі трэба будаваць, кароў і цялят нармальна ўтрымліваць. Хопіць ужо гэтых палацаў і культурных аб'ектаў. Важней, напэўна, людзям пабудаваць жыллё. Не трэба раскідвацца грашыма, якіх у вас няма. Аб'ектыўна трэба сітуацыю ацэньваць. І спыніць будаўніцтва ўсялякіх музеяў, дамоў адпачынку — гэтыя трэба задзейнічаць».**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што будзе пабудаваны Нацыянальны гістарычны музей, дзе будзе сабрана ўсё разам. Па яго словах, дастаткова гэтага музея, тым больш што на месцах іх ужо «акіян». Тое самае і па іншых аб'ектах.

## ВАЛЮТА ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ

Пэўныя навацыі прапануюцца ў падатковым заканадаўстве і яго адмініcтраванні. Аднак узгодненага меркавання сярод прысутных па падатковых правілах няма. «Паўстае пытанне: не толькі чаму няма, Дзмітрый Мікалаевіч (кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. — **«Зв.»**), а чаму вы прыйшлі да мяне, не ўзгадніўшы? Вы цяпер будзеце перада мной мудрагеліць і выказваць кожны сваё меркаванне? Недапушчальна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Адносна крэдытнай палітыкі Прэзідэнт папярэдзіў, што ён чакае ад Нацыянальнага банка зразумелага плана дзеянняў, цалкам увязанага з параметрамі росту эканомікі. «Вы ведаеце, чаму вы туды накіраваны, не для адпачынку і не таму, што вы дрэнна працавалі, я вам ужо пра гэта казаў. А таму што вы як ніхто іншы разумееце, што такое Нацыянальны банк для эканомікі», — звярнуўся беларускі лідар да кіраўніка Нацбанка Рамана Галоўчанкі.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, што новага кіраўніцтва Нацбанка прапануе для падтрымкі экспарцёраў, спытаў, якая стратэгія кіравання золатавалютнымі рэзервамі і на што выкарыстоўваюцца дадатковыя даходы. Прэзідэнт станоўча ацаніў факт росту золатавалютных рэзерваў, але звярнуў увагу на іншы момант:

**«Тое, што валюты больш з'яўляецца, гэта добра. Але валюта павінна працаваць. І трэба мець запасу столькі, колькі нам трэба. Можа быць, патрошку і пускаць у абарот гэтыя грошы. Па-гаспадарску трэба дзейнічаць».**

## «ПАТРЭБНА СПРАВЯДЛІВАЕ ЦЭНАЎТВАРЭННЕ»

Найважнейшым пытаннем кіраўнік дзяржавы назваў кантроль інфляцыі. Нацыянальны банк сумесна з урадам прапануюць яе на ўзроўні 7 %. «Значыць, трэба будзе прапісаць там «да», — адзначыў Прэзідэнт.

«Нагадаю, людзям патрэбна цэнавая стабільнасць, а не стабільны рост цэн!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што нядаўна «дапытваў» першага віцэ-прэм'ера Мікалая Снапкова ў тым ліку па пытаннях цэнаўтварэння. «Вы за гэта несяце персанальную адказнасць. Мы яшчэ пагаворым на гэту тэму. Нам не трэба, як тут некаторыя пішуць, стрымліваць рост цэн, яшчэ нешта.

**Патрэбна справядлівае цэнаўтварэнне, каб людзі маглі купіць неабходнае, — нагадаў беларускі лідар сваё нязменнае патрабаванне. — Іншых людзей у нас няма і не будзе. Гэта нашы людзі, мы начальнікі, яны нас выбіраюць. Мы павінны працаваць у іх інтарэсах, і дзесьці накіроўваць трэба».**

## «УСЁ ТРЭБА РАБІЦЬ СВОЕЧАСОВА»

Асобна Прэзідэнт засярodзіў увагу на пытаннях сельскай гаспадаркі — найважнейшай сферы эканомікі. Ён падкрэсліў важнасць своечасовага выканання восеньскіх палявых работ, уключаючы ўборку ўраджаю, узворванне і ўзняцце зябліва, унясенне ўгнаенняў, падрыхтоўку глебы да наступнага сезона.

Аляксандр Лукашэнка коратка пацікавіўся ходам сельскагаспадарчых работ у старшынь аблвыканкамаў, якія таксама прысутнічалі на нарадзе. Асобная ўвага — Гродзенскай вобласці, адной з вядучых па многіх паказчыках у АПК. Аднак сёлета ў рэгіёне яшчэ не завершана ўборка некаторых культур. Губернатар Юрый Караеў далажыў, што сітуацыя пад кантролем, сяўба азімых скончана цалкам.

Кіраўнік дзяржавы ў сваю чаргу заўважыў, што ў Гродзенскай, Брэсцкай і Мінскай абласцях яшчэ не прыступілі да ўздыму зябліва.

**«Маразы вось-вось наступяць. Калі не падымем зябліва, не пераарoм, у нас будзе такая запарка вясной, што мы не пра ўраджай будзем гаварыць... Таму сёння трэба дзень і ноч працаваць», — арыентуе кіраўнік дзяржавы.**

Ён папярэдзіў, што за страты на палях з губернатараў па выніках года сур'ёзна спытае. Напрыклад, на палях яшчэ застаецца кукуруза, якасць якой з кожным днём губляецца. Яе трэба як мага хутчэй збіраць, нарыхтоўваць у плюшчаным выглядзе, што вельмі добра для кармлення жывёлы. Тым больш абсталявання для плюшчэння зерня і нарыхтоўкі такога корму ў краіне дастаткова.

Прэзідэнт пахваліў вынікі работы ў Мінскай вобласці, якую назваў складанай. А кіраўніцтва Гомельскай і Віцебскай абласцей папярэдзіў, што стан сельскай гаспадаркі будзе прынцыпова вывучаны, асабліва ў частцы таго, што зроблена для выпраўлення сітуацыі з падзяжом жывёлы.

***

Праекты прагнозных дакументаў дэталёва разглядаліся Міжведамаснай камісіяй па бяспецы ў эканамічнай сферы пры Савеце Бяспекі і экспертным саветам пры Савеце Рэспублікі. Маюцца адпаведныя заключэнні. Яны таксама былі вынесеныя на абмеркаванне на нарадзе. Аляксандр Лукашэнка заклікаў працаваць так, каб не выглядаць, як у Маякоўскага, «прозаседавшимися».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**



АКТУАЛЬНА

# ЗА СПРАВУ!

## Рэспубліканскі суботнік пройдзе ў Беларусі 25 кастрычніка

Адпаведную пастанову падпісаў **Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН.** Пра гэта паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Тут растлумачылі, што грашовыя сродкі, заробленыя ад правядзення восеньскага суботніка, пойдуць (50 %) на будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі і стварэнне яго пастаяннай экспазіцыі. Другая частка (50 %) застанецца ў распараджэнні аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама з магчымасцю іх накіравання на канкрэтныя аб'екты.

# ЭФЕКТ АД СВАЙГО

## БелАЭС умацавала энергетычную бяспеку Беларусі і павысіла яе тэхналагічны суверэнітэт

Пра гэта заявіў намеснік Прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ на міжнародным форуме «Расійскі энергетычны тыдзень» у Маскве.



— Гэты аб'ект пабудаваны сумесна з нашым стратэгічным партнёрам — дзяржкарпарацыяй «Расатам» — і адпавядае самым высокім патрабаванням па бяспецы. Атамная электрастанцыя забяспечыла ўмацаванне энергетычнай бяспекі, павышэнне тэхналагічнага суверэнітэту і вытворчага патэнцыялу ключавых галін эканомікі, такіх як энергетыка, прамысловасць, будаўнічы комплекс, ахова здароўя, — заявіў ён.

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, увод БелАЭС дазволіў задаволіць патрэбнасць у электрычнай энергіі, якая расце. За 2024 год аб'ём яе спажывання дасягнуў 43 мільярды кілават-гадзін, рост за апошнія пяць гадоў склаў 6 мільярдаў.

Для задавальнення ўзрастаючага попыту рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва ў электраэнергіі ў краіне штогод пашыраюцца работы па мадэрнізацыі электрасеткавай інфраструктуры.

За апошнія пяць гадоў аб'ёмы рэканструкцыі электрасетак у Беларусі выраслі ўдвая, пабудаваны сучасныя лічбавыя падстанцыі розных класаў напружання, рэалізаваны праекты па ўкараненні аўтаматызаваных сістэм кіравання электрасеткавым комплексам.

— За кошт развіцця электратранспарту, шырокага выкарыстання электраэнергіі для ацяплення жыллёвага фонду палепшыўся камфорт пражывання нашых грамадзян. Гэта тыя задачы, якія ставіць перад энергакомплексам Прэзідэнт нашай краіны, — сказаў віцэ-прэм'ер.

Акрамя таго, Віктар Каранкевіч звярнуў увагу на экалагічны эфект ад дзейнасці БелАЭС: за яе кошт краіна скараціла выкіды парніковых газаў больш чым на 20 мільёнаў тон.

Разам з тым у Беларусі працягвае развівацца газавая сфера.

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, арганізацыі газавай галіны з'яўляюцца адным з лідараў па ўкараненні і тыражаванні ў краіне найноўшых тэхналогій — ад стварэння лічбавых двайнікоў да прадастаўлення якасна новых паслуг спажыўцам. Пры гэтым значная частка інавацыйных праектаў рэалізуецца з ужываннем уласных праграмных комплексаў.

— Мы вельмі многае робім у сферы імпартазамяшчэння, распрацоўваем сучасныя лічбавыя прадукты сваімі сіламі і фактычна не залежым ад імпарту, — падкрэсліў ён.

Лічбавыя рашэнні дазваляюць комплексна вырашаць адразу некалькі важных задач: павышаць надзейнасць газазабеспячэння, скарачаць выдаткі, адпаведна, павышаць эфектыўнасць работы галіны.

Так, за апошнія 10 гадоў дзякуючы лічбавізацыі бізнес-працэсаў газазабеспячальныя арганізацыі краіны пры павелічэнні колькасці абанентаў на 15 % і працягласці газаправодаў на 37 % скарацілі колькасць персаналу, які абслугоўвае газаразмеркавальныя сеткі, на 7 %. Усё гэта стала магчыма дзякуючы ўкараненню сучасных тэхналогій, адзначыў віцэ-прэм'ер.

### Наша даведка

Форум праходзіць у Маскве з 15 да 17 кастрычніка. Гэта адна з найбуйнейшых дыскусійных пляцовак для абмеркавання асноўных тэндэнцый развіцця паліўна-энергетычнага комплексу. На выстаўцы форуму прадстаўлены найноўшыя праекты і тэхналогіі ў энергетычнай галіне.

Мерапрыемства традыцыйна праходзіць з удзелам прадстаўнікоў дзяржорганаў, кіраўнікоў найбуйнейшых кампаній энергетычнай галіны, галіновых арганізацый, прадстаўнікоў навуковай і экспертнай супольнасці.

Сёлета форум сабраў удзельнікаў з больш чым 80 краін. Дзелавой праграмай прадугледжана звыш 70 тэматычных мерапрыемстваў. Галоўная тэма форуму — «Ствараючы энергетыку будучыні разам».

# ПОПЫТ ЁСЦЬ

## На беларускай таварнай біржы на 70 % вырас аб'ём здзелак з Расіі

У 1,7 раза (да 25 мільёнаў долараў) вырасла сума здзелак расійскіх тавараавытворцаў па рэалізацыі несыравіннай прадукцыі на таргах Беларускай універсальнай таварнай біржы па выніках студзеня — верасня 2025-га, паведамілі на біржы.



Тут дадалі, што найбольшы аб'ём продажаў прыйшоўся на запчасткі і камплектуючыя для спецтэхнікі, вымяральныя прыборы, прамысловы інструмент, электраўхавікі, акумулятарныя батарэі, помпавае абсталяванне, будматэрыялы і тэкстыльныя вырабы. Пры гэтым звыш 80 % здзелак забяспечыў экспарт імпартазамяшчальнай прадукцыі.

Па даных БУТБ, у студзені — верасні 2025 года экспартныя біржавыя здзелкі з несыравіннымі таварамі на рэгулярнай аснове заключалі 113 расійскіх кампаній і індывідуальных прадпрымальнікаў. У якасці пакупнікоў на біржавых таргах выступалі не толькі беларускія прадпрыемствы, але і рэзідэнты іншых краін. Так, акрамя Беларусі, у спіс асноўных рынкаў збыту расійскай прадукцыі праз БУТБ таксама ўвайшлі Арменія, Казахстан і Кыргызстан.

Акрамя таго, сёлета Беларуская біржавая платформа актыўна выкарыстоўвалася для міжрэгіянальнага гандлю ў межах Расійскай Федэрацыі. Лідарамі па аб'ёмах такіх здзелак па выніках 9 месяцаў сталі Маскоўская, Новасібірская і Чалябінская вобласці Расіі.

МТБанк

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**30 сентября 2025 года**

Наименование банка:
Закрытое акционерное общество «МТБанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30.09.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 321 826 | 384 294 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 6 097 | 4 953 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 744 500 | 511 188 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 352 549 | 457 480 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 153 789 | 147 611 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 054 800 | 2 763 764 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 1 869 | 1 456 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 137 110 | 118 247 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 245 | 115 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 30 047 | 55 532 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 4 802 832 | 4 444 640 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 72 872 | 121 382 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 3 751 486 | 3 425 559 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 175 222 | 189 303 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 79 213 | 64 691 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 078 793 | 3 800 935 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 175 628 | 65 598 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 284 555 | 122 131 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 18 131 | 19 947 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 245 725 | 436 029 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 724 039 | 643 705 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 4 802 832 | 4 444 640 |

**ОТЧЕТ**
**о прибылях и убытках**
**за период, начинающийся 1 января**
**и заканчивающийся 30 сентября 2025 года**

Наименование банка:
Закрытое акционерное общество «МТБанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30.09.2025 | 30.09.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 304 141 | 215 416 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 170 664 | 99 200 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 133 477 | 116 216 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 188 831 | 165 435 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 76 850 | 67 325 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 111 981 | 98 110 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 2455 | 1486 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (2 839) | 742 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 57 750 | 45 011 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 29 428 | 15 790 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 9 777 | 10 551 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 162 494 | 144 909 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 9 861 | 7 004 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 110 818 | 104 413 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 29 075 | 25 941 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 81 743 | 78 472 |

Председатель Правления Д.П. Шидлович

Главный бухгалтер Е.М. Грибанова

Дата подписания: 7 октября 2025 г.

Адреса интернет-страниц сайта,
на которых размещена квартальная отчетность о деятельности Банка:
1. бухгалтерский баланс https://www.mtbank.by/about/reporting/balance/
2. отчет о прибылях и убытках https://www.mtbank.by/about/reporting/profit-loss/

УНП 100394906

Учреждение образования
«Белорусский государственный университет культуры и искусств»

**ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС**

на замещение должностей педагогических работников, относящихся к профессорско-преподавательскому составу:

**ЗАВЕДУЮЩИЙ КАФЕДРОЙ**

• кафедра межкультурных коммуникаций и рекламы – 1 штатная единица;
• кафедра хореографии – 1 штатная единица;
• кафедра хоровой музыки – 1 штатная единица.

Квалификационные требования: высшее образование, ученая степень доктора или кандидата наук, или ученое звание профессора или доцента, или почетное звание Республики Беларусь в соответствующей сфере, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей не менее 5 лет.
Срок избрания – 5 лет.

**ПРОФЕССОР**

• кафедра межкультурных коммуникаций и рекламы – 1 штатная единица;
• кафедра социально-гуманитарных дисциплин – 1 штатная единица.

Квалификационные требования: высшее образование, ученая степень доктора или кандидата наук, или ученое звание профессора или доцента, или почетное звание Республики Беларусь в соответствующей сфере, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей не менее 5 лет.
Срок избрания – 5 лет.

**ДОЦЕНТ**

• кафедра менеджмента социально-культурной деятельности – 1 штатная единица;
• кафедра белорусской и зарубежной филологии – 1 штатная единица;
• кафедра социально-гуманитарных дисциплин – 1 штатная единица;
• кафедра духовой музыки – 1 штатная единица;
• кафедра народно-инструментальной музыки – 2 штатные единицы;
• кафедра эстрадной музыки – 1 штатная единица;
• кафедра хоровой музыки – 2 штатные единицы;
• кафедра декоративно-прикладного искусства – 1 штатная единица.

Квалификационные требования: высшее образование, ученая степень доктора или кандидата наук, или ученое звание профессора или доцента, или почетное звание Республики Беларусь в соответствующей сфере, стаж работы в должностях педагогических, научных работников, должностях руководителей не менее 5 лет.
Срок избрания – 5 лет.

**СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ**

• кафедра хореографии – 1 штатная единица;
• кафедра декоративно-прикладного искусства – 1 штатная единица;
• кафедра режиссуры – 1 штатная единица.

Квалификационные требования: высшее образование и наличие степени магистра (высшее образование и наличие научной квалификации «Исследователь», высшее образование и наличие ученой степени), стаж работы в должностях педагогических, научных работников не менее 3 лет либо высшее образование и стаж работы в должностях служащих, относящихся к категории «Руководители» или «Специалисты», работа которых соответствует направлению образования, не менее 5 лет.
Срок избрания – бессрочно.

**ПРЕПОДАВАТЕЛЬ**

• кафедра информационных технологий в культуре – 1 штатная единица;
• кафедра информационно-аналитической деятельности – 0,5 штатной единицы;
• кафедра эстрадной музыки – 1 штатная единица;
• кафедра хоровой музыки – 1 штатная единица.

Квалификационные требования: высшее образование и наличие степени магистра (высшее образование и наличие научной квалификации «Исследователь», высшее образование и наличие ученой степени) и стаж работы в должностях педагогических, научных работников не менее 1 года. Срок избрания – бессрочно.

**Дата и время проведения конкурса: 17.12.2025 в 10.00.**

**Место проведения конкурса:
г. Минск, ул. Рабкоровская, 17, каб. 207.**

**Срок подачи документов: с 17.10.2025 по 16.11.2025 по адресу: 220007, г. Минск, ул. Рабкоровская, 17, отдел правовой и кадровой работы, каб. 6.**

**Контактный телефон (017) 3739023**

УНП 100286677



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) проводит электронные торги по продаже **шести транспортных средств (легковые седаны GEELY SC7)** одним лотом, бывших в употреблении, принадлежащих **МАРТ** (УНП 100377891) с начальной ценой лота (без НДС) – **37 000,00 бел. руб.**
**Оператор ЭТП –** ООО «ИПМ-Консалт оценка» (УНП 191224638).
С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by и оператора ЭТП **www.ipmtorgi.by**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 18.11.2025.**
**Дата и время окончания приема заявок:** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by по **17.11.2025 до 17.00**

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by


# КАНТРОЛЬ, БЕЗАДХОДНАСЦЬ,

## Даведаліся, у чым сакрэт прадукцыі «Гомельдрэў»,

**Поўны цыкл, безадходная вытворчасць і шматступеньчаты кантроль: прадпрыемства «Гомельдрэў» на прыкладзе сваёй вытворчасці паказвае, як выконваецца Ўказ Прэзідэнта аб пяцігодцы якасці.**



У пачатку гэтага года Беларусь узяла новы курс. Перыяд з 2025 па 2029 год аб'яўлены пяцігодкай якасці — дакладны арыенцір для ўсёй краіны: тавары і паслугі павінны стаць лепшымі, а разам з імі — і ўзровень жыцця людзей. Сімвалам пачатку гэтага маштабнага для краіны шляху стаў абноўлены Дзяржаўны знак якасці, які ўжо атрымалі першыя лаўрэаты. У гэтым ганаровым спісе найлепшых беларускіх тавараў, якія адпавядаюць найвышэйшым стандартам і азначаны Дзяржаўным знакам якасці, — ламінат VIVAFLOOR прадпрыемства «Гомельдрэў». Для калектыву завода такое прызнанне на самым высокім узроўні — арыенцір для далейшага развіцця ў сваёй прафесіі.

### АД САВЕЦКАЙ ТРАДЫЦЫІ ДА СУЧАСНАГА ПАДЫХОДУ

З савецкіх часоў Знак якасці прыраўноўваўся да знака даверу. Гэты значок на ўпакоўцы ці самім вырабе быў для пакупніка гарантыяй, што прадукт зроблены сумленна. Так, яшчэ ў савецкія гады прадукцыя «Гомельдрэва» ўжо мела гэту ганаровую адзнаку.

Гісторыя завода пачалася ў 1879 годзе. За паўтара стагоддзя ён прайшоў шлях ад некалькіх сталярных майстэрняў да высокатэхналагічнай вытворчасці. Магутным штуршком у развіцці стаў запуск у 2014 годзе сучаснага завода МДФ у Рэчыцы. Найскладанейшыя прэсы і аўтаматызаваныя лініі наладжвалі і запускалі спецыялісты, якія і сёння складаюць аснову калектыву. Менавіта пераемнасць пакаленняў работнікаў, перакананых на «Гомельдрэў», дапамагае прадпрыемству працаваць стабільна і пастаянна развівацца.



Прадпрыемства здолела заявіць аб сабе не толькі на айчынным, але і на знешнім рынку. Яно вытрымлівае велізарную канкурэнцыю, чым даказвае, што беларускі прадукт адпавядае міжнародным стандартам і заваёўвае давер пакупнікоў. На «Гомельдрэве» да якасці ставяцца як да галоўнага прынцыпу работы. І якасць перш за ўсё пачынаецца з сыравіны. Уласная лесанарыхтоўка дазваляе кантраляваць кожны этап — ад спілоўвання дрэва да яго перапрацоўкі.

Якасць падлогавага пакрыцця, адзначанага Знакам якасці, нараджаецца яшчэ ў лесе. Сыравіна (бяроза, хвоя, вольха), якая выкарыстоўваецца ў вытворчасці, праходзіць шматступеньчатую ачыстку і каліброўку. На прадпрыемстве выверааны да дробязяў кожны тэхналагічны этап. Спачатку драўніна праходзіць акорку, драбненне, сартаванне. Атрыманая дранка прамываецца, размолваецца ў валакно, насычаецца смоламі і сушыцца гарачым паветрам. Дарэчы, сушыльныя ўстаноўкі працуюць ад энергіі, якую кантралююць падчас спальвання кары і драўняных адходаў. Так дасягаецца поўная безадходнасць і энергаэфектыўнасць вытворчасці.

Дарэчы, ламінат — гэта трохслаёвая канструкцыя. Ніжні слой — падпласт — забяспечвае стабільнасць. Пасля ідзе дэкаратыўны пласт, а завяршае «пірог» — аверлей, меламінавая плёнка, узмоцненая аксідам алюмінію. Менавіта яна абараняе падлогавае пакрыццё ад зносу.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

# «КВАДРАТ» З ПАДТРЫМКАЙ

### АД ЧАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ ПАМЕР ДАПАМОГІ?

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Таццяна ВАСІЛЮЧАК** адзначыла, што сёлета ў краіне неабходна пабудаваць не менш за 4,5 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Па выніках 9 месяцаў узведзена 2 мільёны 942 тысячы «квадратаў», што больш за практычна 65 % ад агульнага аб'ёму. Па тэмпах будаўніцтва наперадзе Брэстчына і Магілёўшчына.

«Шматдзетныя сем'і могуць атрымаць ільготныя крэдыты на жыллё пад 1 % гадавых на 40 гадоў», — паведаміла **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Іна ПІНКОЎСКАЯ**. «Для іншых ільготнікаў — гэта 5 % гадавых, тэрмін карыстання — 20 гадоў», — удакладніла яна. Больш за тое, жыхарам населеных пунктаў, дзе пражывае не больш за 20 тысяч чалавек, прапануюць стаўку ўвогуле 3 %.




Фота БелТА.

Далёка не ўсе катэгорыі грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў буйных гарадах, могуць разлічваць на дзяржпадтрымку, звярнула ўвагу Іна Пінкоўская. «У той жа час любы чалавек, які будуе жыллё ў населеным пункце з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч і ў гарадах-спадарожніках, патэнцыйна адносіцца да ліку атрымальнікаў дзяржпадтрымкі», — падкрэсліла яна.

Памер дапамогі пры будаўніцтве жылля залежыць ад колькасці членаў сям'і. «Гэта 20 квадратных метраў, у межах якіх прадастаўляецца дзяржаўная падтрымка на кожнага члена сям'і ва ўсіх гарадах краіны, акрамя Мінска (у сталіцы субсідзіруецца 15 «квадратаў» на аднаго чалавека), і для шматдзетных сем'яў», — патлумачыла прадстаўнік Мінбудархітэктуры.

### ВАРЫЯНТЫ Ў СТАЛІЦЫ

**Старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА** паведаміла, што ў сталіцы за 9 месяцаў пабудавана каля 413 тысяч квадратных мет-

# ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

## уганараванай Знакам якасці







У цэлым ламінат уяўляе сабой высокатэхналагічны кампазіцыйны матэрыял, якасць якога вызначаецца сотнямі параметраў. Каб яе забяспечыць, на прадпрыемстве ўкаранёная шматступенная сістэма кантролю. Правяраецца ўсё: ад якасці драўніны да гатовай спакаванай пачкі ламінату.

Як звяртае ўвагу **намеснік генеральнага дырэктара — начальнік упраўлення якасці ААТ «Гомельдрэў» Таццяна ЧАРНЫШОВА**, на прадпрыемстве строга выконваюць усе тэхналагічныя рэгламенты вытворчасці:

— Кожныя тры гадзіны тэхнолагі адбіраюць узоры пліты і адпраўляюць на праверку ў лабараторыю. Прадукцыя правяраецца трываласцю на выгіб і расцяжэнне, шчыльнасць, узровень вільготнасці, аднастайнасці структуры. Пліта праходзіць выпрабаванне ўздзеяннем розных тэмператур — ад -5 да +30 градусаў.

Акрамя таго, пасля ацэнкі якасці ў лабараторыі прадукт праходзіць і практычныя выпрабаванні. Ламелі замочваюць у вадзе на суткі, каб праверыць ступень разбухання. Імітуецца інтэнсіўная нагрузка на ламінат, удары, уздзеянне ўльтрафіялету. Подлогавае пакрыццё гомельскіх вытворцаў праходзіць тэст на выціранне: у спецыяльнай машыне, пад ціскам, ламінат падвяргаецца ўздзеянню абразіўнага матэрыялу.

### ЭКАЛАГІЧНАСЦЬ ЯК СКЛАДНІК ЯКАСЦІ

На прадпрыемстве дзейнічае сістэма шматузроўневага кантролю. Правяраюцца не толькі гатовыя ламелі, але і ўся сыравіна, смолы, дэкаратыўныя плёнкі. Прадукцыя праходзіць выпрабаванні на адпаведнасць стандарту СТБ 13329-2018, пажарнай бяспецы, санітарна-гігіенічным патрабаванням.

Увогуле, усе прадукты арганізацыі маюць міжнародныя сертыфікаты экалагічнай бяспекі. Прадпрыемства ў вытворчасці выкарыстоўвае малатаксічныя смолы і сістэму «экарэзінатар», якая змяншае расход клейкіх складаў. У якасці прыроднага звязвальнага кампанента ўжываюць лігнін — рэчыва, якое змяшчаецца ў самой драўніне. Ламінат атрымліваецца бяспечным, яго можна класці ў дзіцячых пакоях і спальнях.

### АДКАЗНАСЦЬ ЗА ЗНАК ЯКАСЦІ

Сёння на прадпрыемстве працуе каля 1700 чалавек. І для кожнага супрацоўніка прысуджэнне «Знака якасці» прадукцыі іх прадпрыемства — вялікі гонар, разуменне таго, што кожны дзень на сваім працоўным месцы робіш тое, што важна для тваёй Радзімы.

Як адзначае **генеральны дырэктар ААТ «Гомельдрэў» Юрый КУЗНЯЦОЎ**, Дзяржаўны знак якасці — гонар для калектыву. «Гэта новы старт, новы віток развіцця, які перш за ўсё патрабуе высокай адказнасці перад спажыўцом і перад краінай. Адзнака на такім узроўні — гэта доказ, што мы на правільным шляху. Але цяпер наша задача — з яшчэ большай энергіяй пацвярджаць гэты давер, развівацца і станавіцца лепшымі».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота з архіва прадпрыемства.**

# ДЗЯРЖАВЫ



раў жылля. З іх 78,7 тысячы ўзведзена з выкарыстаннем дзяржпадтрымкі, 18 тысяч — арэнднае жыллё, у тым ліку ў горадзе Смалявічы і пасёлку Сонечны. Уведзена ў эксплуатацыю 871 кватэра для шматдзетных. Будуюцца для агульнай чаргі маючых патрэбу два арэндныя жылыя дамы. У першую чаргу іх будуць засяляць асабліва запатрабаваныя спецыялісты, якіх трэба замацаваць у Мінску. Рашэннем Мінгарвыканкама вызначаны іх катэгорыі — гэта вадзіцелі гарадскога транспарту, тунэльныя рабочыя, маляры, тынкоўшчыкі, рабочыя па комплекснай прыборцы, утрыманні домаўладанняў і будынкаў.

Станоўча зарэкамендавала сябе практыка ўзвядзення жылля за кошт уласных сродкаў прадпрыемстваў. У гэтым выпадку яны звяртаюцца ў камітэт будаўніцтва і інвестыцый з просьбай вылучыць квоту на будаўніцтва пэўнай колькасці кватэр для сваіх работнікаў. Банкі даюць ім субсідыі. Потым кватэры выкарыстоўваюць у якасці арэндных для маладых і асабліва запатрабаваных спецыялістаў.

Як заўважыла Ірына Гонтарава, аб'ём будаўніцтва жылля ў Мінску будзе зніжацца. З часам у год стануць узводзіць не больш за 500 тысяч квадратных метраў. На стадыі завяршэння знаходзіцца комплекс «Мінск-Мір». Новая буйная пляцоўка, якую будзе забудоўваць інвестар, — «Паўночны бераг».

Што датычыцца кватэр для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то перспектыўнай пляцоўкай стане Зялёны Бор. Да 2040 года там пабудуюць 4-4,5 мільёна «квадратаў» жылля, а таксама школы, дзіцячыя садкі, паліклінікі. Забудова будзе весціся ў некалькі чэргаў, першая прадугледжвае каля 200 тысяч квадратаў. Цяпер ідзе праектаванне неабходных інжынерных сетак, пад'язных шляхоў. На гэтай пляцоўцы камерцыйнага жылля наогул не будзе, лічыць спецыяліст.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды», квадратны метр для чаргавікоў, які ўзводзіцца з дзяржпадтрымкай, каштуе ад 2700 да 2900 рублёў. У цагляным і маналітным выкананні — крыху даражэй. Пры гэтым дольшчыкаў сярод маючых патрэбу больш не будзе. З-за вялікай колькасці скарг на павелічэнне тэрмінаў будаўніцтва і іншыя праблемы вырашана, што дамы будуць узводзіць без удзелу грамадзян, за кошт УКБ. Тыя будуць браць крэдыты, а пасля прадаваць гатовае жыллё чаргавікам, значыць, пераафармляць на канкрэтнага грамадзяніна крэдытныя рэсурсы, затрачаныя на будаўніцтва яго кватэры.

Дарэчы, як адзначылі эксперты, сёння ў Мінску цана «квадрата» камерцыйнага жылля дасягае 2 тысяч долараў у эквіваленце.

**Сяргей КУРКАЧ.**


БЕЛ ВЭБ

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Место нахождения ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

Форма 1

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
30 сентября 2025 г.
**ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30.09.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 169 984 | 157 215 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 593 079 | 682 103 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 617 070 | 367 740 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 579 918 | 1 358 847 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 945 255 | 3 028 651 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 520 | 105 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 15 049 | 15 049 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 157 372 | 151 340 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 652 | – |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 4 032 | 3 016 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | – | – |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 44 212 | 46 102 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 6 128 143 | 5 810 168 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 10 870 | 16 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 981 791 | 833 590 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 3 904 244 | 3 836 366 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 258 229 | 196 795 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 22 | – |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 35 | 35 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 68 629 | 50 429 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 5 223 820 | 4 917 231 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 117 408 | 117 408 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | – | – |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 97 918 | 86 669 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса и резервы | 1214 | | (8 206) | 41 994 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 697 203 | 646 866 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 904 323 | 892 937 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 6 128 143 | 5 810 168 |

Форма 2

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
за 9 месяцев 2025 года
**ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | За 9 месяцев 2025 года | За 9 месяцев 2024 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 402 646 | 319 922 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 239 144 | 173 178 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 163 502 | 146 744 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 106 827 | 84 738 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 29 427 | 28 062 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 77 400 | 56 676 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 183 | 66 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (3 248) | 8 140 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 29 209 | 23 108 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 3 698 | (196) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 22 135 | 4 712 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 8 856 | 10 537 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 149 239 | 125 359 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 6 305 | 2 669 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 101 921 | 112 335 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 5 022 | 15 953 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 96 899 | 96 382 |

Председатель Правления банка В.С. Матюшевский

Главный бухгалтер – директор департамента бухгалтерского учета и налогообложения О.С. Турбина

Дата подписания: 10 октября 2025 г.

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте **www.belveb.by** в разделе «Раскрытие информации/Годовая отчетность/Финансовые показатели/Отчетность/Отчетность в соответствии с требованиями Национальных стандартов (НСФО)/Квартальная отчетность за 2025 год.

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 09.06.2025 № 6. УНП 100010078

**ИЗВЕЩЕНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**открытого акционерного общества**
**«МИНСКТЕЛЕКОМСТРОЙ»**

## О ПРОВЕДЕНИИ СОВМЕСТНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**открытого акционерного общества «БЕЛСВЯЗЬСТРОЙ», открытого акционерного общества «МИНСКТЕЛЕКОМСТРОЙ» и открытого акционерного общества «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»**

Открытое акционерное общество «МИНСКТЕЛКОМСТРОЙ» (далее – Общество), местонахождение: Республика Беларусь, 220037, г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, извещает, что 29 октября 2025 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, 220037, г. Минск, ул. Аннаева, д. 49, актовый зал, состоится повторное совместное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «БЕЛСВЯЗЬСТРОЙ», открытого акционерного общества «МИНСКТЕЛКОМСТРОЙ» и открытого акционерного общества «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ» (далее – собрание акционеров).
Форма проведения собрания акционеров – очная.

**Повестка дня**

1) Об увеличении уставного фонда открытого акционерного общества «БЕЛСВЯЗЬСТРОЙ».
2) О дополнительном выпуске акций открытого акционерного общества «БЕЛСВЯЗЬСТРОЙ».
3) О внесении изменений и (или) дополнений в Устав открытого акционерного общества «БЕЛСВЯЗЬСТРОЙ».

Предложения в повестку дня собрания акционеров принимаются с 17 октября 2025 г. и не позднее 21 октября 2025 г.

Дата формирования реестра акционеров для составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, – 17 октября 2025 г.

Собрание акционеров созывается по решению наблюдательного совета Общества (основание: протокол от 17 октября 2025 г. № 115).

С материалами, подготовленными к собранию акционеров, можно ознакомиться с 20 октября 2025 г. по 28 октября 2025 г. включительно в рабочие дни с 14.00 до 15.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, кабинет юрисконсульта, в день проведения собрания акционеров – по месту проведения собрания (Республика Беларусь, 220037, г. Минск, ул. Аннаева, д. 49, актовый зал) с 09.45 до 10.45 – для акционеров открытого акционерного общества «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ», открытого акционерного общества «МИНСКТЕЛКОМСТРОЙ» и открытого акционерного общества «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ». Подготовленная к собранию акционеров информация (документы) предоставляется для ознакомления в виде проектов и копий документов.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, проводится 29 октября 2025 г. по месту проведения собрания акционеров (Республика Беларусь, 220037, г. Минск, ул. Аннаева, д. 49, актовый зал) с 09.45 до 10.45.

Лица, имеющие право на участие в собрании акционеров, при ознакомлении с материалами, подготовленными к собранию акционеров, и при регистрации обязаны представить: физическое лицо – документ, удостоверяющий личность; руководитель юридического лица – документ, удостоверяющий личность, а также оригинал или надлежащим образом удостоверенную копию документа, подтверждающего полномочия руководителя; представитель акционера – документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности. Работник, определенный приказом единоличного исполнительного органа Общества для выполнения функций по ознакомлению акционеров (их представителей) с информацией (документами) при подготовке к проведению собрания акционеров, и председатель группы регистрации вправе изготовить копии с представленных лицами, имеющими право на участие в собрании акционеров, документов (за исключением документов, удостоверяющих личность), подтверждающих полномочия руководителя юридического лица, полномочия представителя акционера, и удостоверить соответствие копий таких документов представленным оригиналам.

УНП 100068131



## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в аг. Драчково Драчковского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Место, дата и время проведения аукциона и подведения итогов | аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19В. Помещение Драчковского сельисполкома, **27.11.2025 г. в 10.00** |
| 3 | Продавец и его адрес | аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19В, Драчковский сельский исполнительный комитет |
| 4 | Организатор аукциона | Драчковский сельский исполнительный комитет |
| 5 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** – площадь 0,15 га, кадастровый номер 624880801101000029, аг. Драчково, ул. Центральная, 54 |
| 6 | Вид права, целевое назначение земельного участка | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земель для размещения объектов усадебной застройки) |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 22000 рублей |

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета www.minsk-region.gov.by, Смолевичского районного исполнительного комитета https://isp@smolevichi.gov.by

УНП 600046589


# РАСПРАЦОЎКІ ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ

## ЗНАЙСЦІ МІШЭНІ

Перспектыўная саюзная праграма нацэлена стварыць тэхналагічную платформу для вытворчасці ў будучым такіх лекаў. З беларускага боку ў праекце ўдзельнічаюць вядучыя арганізацыі НАН Беларусі і медустановы, у прыватнасці РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі і РНПЦ псіхічнага здароўя. З расійскага боку — шэраг арганізацый падведамасных Міністэрству навукі і адукацыі РФ. Першапачатковая мэта вучоных — вывучэнне мембран.

— Сучасная падыходы распрацоўкі лекаў называюць рацыянальнымі. Гэта звязана з тым, што даследчыкі шукаюць малекулы, якія выбарачна звязваюцца з пэўнай мішэнню (як правіла, гэта пэўны бялок) нашага арганізма ці мішэнню патагеннага арганізма — калі гаворка ідзе аб распрацоўцы антыбіётыкаў. Пры гэтым такія малекулы павінны аказваць мінімальнае дзеянне на бялкі, якія адрозніваюцца ад мішэні, — расказвае **навуковы кіраўнік праграмы з беларускага боку, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі малекулярнай дыягностыкі і біятэхналогіі Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Беларусі Андрэй ГІЛЕП.**

На сёння фармацэўтычныя кампаніі распрацавалі эфектыўныя алгарытмы для стварэння тэрапеўтычных сродкаў у адносінах да вядомых мішэняў. Пры гэтым асноўнай перашкодай для лячэння шматлікіх захворванняў з'яўляецца недастатковасць ведаў аб механізмах іх развіцця і адсутнасць пэўных мішэняў, змена функцыянавання якіх магла б прывесці да выздараўлення. І тут вялікая роля адводзіцца мембранным бялкам. У адрозненне ад большасці іншых, яны вельмі складаныя, таму што іх складана вылучыць і вывучаць. Але менавіта яны найбольш перспектыўныя мішэні для новых лекаў. Мэта выканання праграмы якраз і нацэлена на вырашэнне дадзенай праблемы — ідэнтыфікацыю новых мішэняў з ліку мембранных бялкоў, якія асацыіраваны з канкрэтнай паталогіяй або канкрэтнай формай патагеннага арганізма.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



У сусветнай фарміндустрыі такія задачы вырашаюць у асноўным шляхам стварэння міжнародных кансорцыумаў. Таму і ў нас прынята рашэнне аб'яднаць намаганні ўсіх вядучых спецыялістаў Саюзнай дзяржавы ў гэтай галіне. Улічваючы, што імі напрацаваны вялізны вопыт за дзесяцігоддзі работы ў гэтай галіне, а беларуска-расійскі кансорцыум «Біямембраны» дзейнічае з 2019 года, ёсць усе перадумовы апярэдзіць замежных калег.

— Прыярытэт праграмы — развіццё імпартаапераджальных тэхналогій. Хаця, безумоўна, шэраг задач па імпартазамяшчэнні таксама будзе вырашаны, — падкрэслівае навуковец.

## АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ

Праграма будзе выконвацца ў 2026 — 2030 гг. Як адзначае Андрэй Гілеп, 5 гадоў — занадта малы тэрмін для поўнага цыкла стварэння фармпрэпаратаў. Ад моманту ідэнтыфікацыі мішэні да выхаду фармпрэпарату на рынак прахо-дзіць у сярэднім 10-15 гадоў.

— У сувязі з гэтымі задачамі праграмы з'яўляюцца ідэнтыфікацыяй мішэняў, іх дэталёвы структурна-функцыянальны аналіз і дызайн, стварэнне прататыпаў лекаў, накіраваных на канкрэтныя мішэні. Акрамя фармпрэпаратаў будуць распрацоўвацца альтэрнатыўныя тэрапеўтычныя сродкі — клетачная імунатэрапія, — пералічвае Андрэй Гілеп.



Трэба сказаць, што вучоныя і раней работалі над гэтымі праблемамі і рэалізоўвалі падобныя распрацоўкі ў рамках іншых праграм. Як адзін з вынікаў — цяпер у Беларусі паспяхова ўкаранёна ў клінічную практыку CAR-T тэрапія пацыентаў з лімфабластным лейкозам. Дадзены тып тэрапіі прымяняецца, калі іншыя спосабы лячэння не дапамагаюць. Пілотны праект быў рэалізаваны сумесна з РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі.

Сутнасць метаду ў тым, што бярэцца кроў пацыента, з яе вылучаюць Т-клеткі імуннай сістэмы — так званыя «клеткі-забойцы». Іх «навучаюць» знаходзіць ракавыя клеткі, размнажаюць і вяртаюць пацыенту. Паколькі гэта яго ўласныя клеткі, арганізм спакойна рэагуе на іх. Для многіх пацыентаў такі метад — апошняя надзея, калі хіміятэрапія і перасадка коснага мозга не працуюць. У рамках праграмы «Саюз Біямембраны» асобны кірунак работ накіраваны на развіццё менавіта гэтага тэрапеўтычнага падыходу — клетачнай імунатэрапіі.

## АСАБІСТЫ ПАДЫХОД

Безумоўны прыярытэт сучаснай медыцыны — персаналізаваная тэрапія. Яна забяспечвае эфектыўнае і бяспечнае лячэнне канкрэтнага пацыента. У рамках праграмы плануецца вырашыць шэраг задач у галіне персаналізаванай медыцыны. Адна з іх — распрацаваць падыходы для персаналізацыі фармакатэрапіі пацыентаў з нейрадэгенератыўнымі захворваннямі.

Падобныя работы і раней праводзіліся. Напрыклад, у супрацоўніцтве з РНПЦ псіхічнага здароўя ўжо створана тэхналогія персаналізаванай фармакатэрапіі для расстройстваў шызафрэнічнага спектра. Справа ў тым, што ў псіхіятрыі нельга прызначаць лекі метадам перабору, як пры лячэнні іншых хвароб. Гэта небяспечна таму, што многія прэпараты выклікаюць цяжкія ўскладненні.

Навукоўцы аналізуюць генетычныя асаблівасці пацыента, вывучаюць, як яго арганізм рэагуе на тыя ці іншыя лекі, і выдаюць рэкамендацыі ўрачам: якія лекі супрацьпаказаны, а якія падыйдуць і ў якой дозе. Гэта зніжае рызыку цяжкіх ускладненняў і павышае эфектыўнасць лячэння. Такі падыход у рамках праграмы будзе распаўсюджаны і на нейрадэгенератыўныя захворванні.

# З ПЕРШЫХ ХВІЛІН — У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

## Што робіцца для захавання здароўя мамы і немаўляці



Унутрычэраўныя аперацыі, высокакваліфікаваная дапамога падчас цяжарнасці і родаў, новыя тэхналогіі ў выходжванні неданошаных дзетак і суправаджэнне іх мультыдысцыплінарнымі камандамі для нівеліравання ўскладненняў — усё гэта даўно прымяняецца ўрачамі службы мацярынства і дзяцінства. Беларусь займае лідарскія пазіцыі ў рэйтынгу краін з самымі нізкімі паказчыкамі дзіцячай смяротнасці, уваходзіць у топ найлепшых дзяржаў свету для нараджэння дзіцяці і самых камфортных для мацярынства.

## У СУСВЕТНЫХ ТОПАХ

Як паведаміла **загадчык лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў РНПЦ «Маці і дзіця» Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ**, ахова мацярынства і дзяцінства — прыярытэтны кірунак развіцця айчыннай медыцыны.

— Дзякуючы падтрымцы дзяржавы мы ўваходзім у топ-10 найлепшых краін свету па паказчыках дзіцячай смяротнасці, гэта рэйтынг 236 краін. Акрамя таго, мы ў ліку 40 дзяржаў свету, якія лічацца самымі спрыяльнымі для нараджэння дзяцей. Усяго ў гэты рэйтынг уваходзіць 180 краін, — адзначыла спецыяліст.

Умовы камфортнага мацярынства ў Беларусі таксама на ўзроўні — тут мы займаем 25-е месца, бо наша рэспубліка ўваходзіць у 50 краін свету, дзе родадапамога забяспечваецца кваліфікаванымі ўрачамі. У сярэднім у свеце родадапамога кваліфікаванымі кадрамі забяспечваецца толькі ў 71 % выпадкаў родаў, у той час як у Беларусі — у 100 %.

— Высокія тэхналогіі і спецыялізаваная медыцынская дапамога забяспечваюць нам добрыя паказчыкі як па здароўі маці, так і па здароўі маленькіх пацыентаў, — адзначыла Маргарыта Дзевялтоўская, дадаўшы, што ў краіне арганізавана рознаўзроўневая сістэма аказання дапамогі. Гэта гарантуе, што пацыенты з усёй рэспублікі могуць атрымліваць высокакваліфікаваную спецыялізаваную дапамогу на 4-м узроўні ў РНПЦ «Маці і дзіця», куды паступаюць жанчыны з самымі складанымі выпадкамі акушэрскай і гінекалагічнай паталогіі, немаўляты са складанымі захворваннямі лёгкіх, нервовай сістэмы.

Акрамя таго, РНПЦ не спыняецца ва ўдасканаленні тэхналогій. З 2009 года ў краіне развіваецца фетальная хірургія, а з 2023-га ў РНПЦ створана аддзяленне фетальнай хірургіі, якое праводзіць каля 100 унутрычэраўных умяшанняў у год. Усяго іх праведзена ўжо больш за тысячу.

Пры гэтым, як і ў многіх развітых краінах свету, у Беларусі актуальнымі застаюцца пытанні бясплоддзя, а таксама павелічэння ўзросту жанчын, якія нараджаюць дзіця ўпершыню. За апошнія гады колькасць выпадкаў бясплоддзя ў жанчын узрасла практычна ў два разы. Таксама павялічваецца колькасць мужчын з праблемамі зачацця. У нашай краіне дзейнічае сістэма ЭКА і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, якая забяспечвае нараджэнне дзяцей у тых сітуацыях, калі раней гэта лічылася немагчымым. За 20 гадоў існавання ЭКА нарадзіліся 10 тысяч дзяцей. На сёння эфектыўнасць ЭКА дасягае 41 %. Як падкрэсліла Маргарыта Дзевялтоўская, гэты паказчык адпавядае сусветнаму ўзроўню і нават перасягае паказчыкі многіх краін.



У Беларусі рэкордная выжывальнасць дзяцей, якія нарадзіліся з вагой да кілаграма. Усе дзеці, якія нараджаюцца ў тэрміне цяжарнасці да 28 тыдняў, паступаюць у РНПЦ «Маці і дзіця». Гэта дае магчымасць прымяняць высокатэхналагічныя метады рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі выходжвання глыбока неданошаных дзяцей. Інвалідна сць сярод дзяцей з вагой менш за 1 кг цяпер не перавышае 17 %, пры гэтым выжывальнасць дасягнула 87,9 %.

— Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што ў нас працуюць прафесіяналы самага высокага класа і ўкараняюцца перадавыя сусветныя тэхналогіі, — падкрэсліла Маргарыта Дзевялтоўская.

## ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ І КЛЕТАЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Перадавыя тэхналогіі прымяняе РНПЦ пры лячэнні спінальнай мышачнай атрафіі і гемафіліі, выкарыстоўвае штучны інтэлект для прагназавання, дыягностыкі і распрацоўкі схем лячэння для глыбока неданошаных дзяцей. Тут прымяняецца тэхналогія тэрапеўтычнай гіпатэрміі, якая дазваляе палепшыць вынік пры ўскладненні родаў — цяжкай асфіксіі ў дзяцей. Цэнтр лячэння асфіксій на сёння працуе для ўсіх рэгіёнаў краіны, а тэрапеўтычная гіпатэрмія з'яўляецца адзіным доказаным спосабам лячэння цяжкіх асфіксій і энцыфалапатый у немаўлят.

Развіваюцца і клетачныя тэхналогіі. Медыкі цэнтра прымяняюць мезэнхімальныя стрaмальныя клеткі пупавіны для лячэння парушэнняў псіханеўралагічнага развіцця, прафілактыкі і лячэння дзіцячага цэрабральнага паралічу, ранняга арганічнага пашкоджання нервовай сістэмы, эпілепсіі. Эфектыўнасць лячэння з дапамогай клетачных тэхналогій дасягае 92 %.

РНПЦ каардынуе сістэму работы цэнтраў, што працуюць з дзецьмі, якія маюць псіхафізічныя асаблівасці (сістэма ранняга ўмяшання). Тут дзейнічае рэспубліканскі кабінет катамністычнага назірання, што дазваляе складаць індывідуальныя праграмы медыцынскай рэабілітацыі і лячэння дзяцей, якія нарадзіліся неданошанымі. Акрамя таго, РНПЦ каардынуе работу сістэмы цэнтраў, дружалюбных да падлеткаў. Гэтыя цэнтры займаюцца матывацыяй падлеткаў да здаровага ладу жыцця і здаровага мацярынства. Такія цэнтры працуюць ва ўсіх рэгіёнах і робяць свой унёсак у тое, каб дзяўчынкі-падлеткі з ранняга ўзросту захоўвалі сваё здароўе, а ў далейшым станавіліся здаровымі мамамі.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА і БелТА.**


Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко», Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, д. 150 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот № 1** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/21, 150/22, 150В, 150, 150/20 | |
| **Здание заправочной склада ГСМ** с инв. № 350/С-204136 общ. пл. 35,5 кв. м, **открытый склад металла** с инв. № 350/С-204137 общ. пл. 3 203,7 кв. м, **склад лакокрасок, ГСМ** с инв. № 350/С-210707 общ. пл. 186 кв. м, **автомобильная дорога на территории** с инв. № 350/С-209431 общ. пл. 40 кв. м, **ангар участка нестандартного оборудования** с инв. № 350/С-206388 общ. пл. 369,1 кв. м. **Сведения о земельных участках: 3 участка** предоставлены на праве постоянного пользования: **1 –** общ. пл. 0,8037 га, **2** – общ. пл. 0,0262 га, **3 –** общ. пл. 0,4458 га | |
| **Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 762 752,00 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Лот № 2** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/17, 150/16, 150 | |
| **Здание специализированное обрабатывающей промышленности (участок механической обработки)** с инв. № 350/С-167815 общ. пл. 837,1 кв. м, **цех безрельсового транспорта** с инв. № 350/С-75350 общ. пл. 569,8 кв. м, **автомобильная дорога на территории** с инв. № 350/С-209428 общ. пл. 93 кв. м. **Сведения о земельных участках: 2 участка** предоставлены на праве постоянного пользования: **1** – общ. пл. 0,6481 га, **2 –** общ. пл. 0,0864 га | |
| **Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 1 285 118,16 бел. руб.** (снижена на 10 %) | |
| **Лот № 3** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150, 150/16, 150-1 | |
| **Корпус опытно-промышленного производства сорбентов** с инв. № 350/С-107542 общ. пл. 2311,3 кв. м, **Автостоянка № 2** с инв. № 350/С-107541 общ. пл. 1812 кв. м, **Зарядная станция** с инв. № 350/С-56078 общ. пл. 172 кв. м. **Помещение транспортного назначения** с инв. № 350/D-182492 общ. пл. 294,9 кв. м. **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,4858 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания корпуса опытно-промышленного производства сорбентов с прилегающими боксами, зарядной станцией, автостоянкой | |
| **Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 811 995,99 бел. руб.** (снижена на 10 %) | |
| Шаг аукциона: 5 % от текущей цены | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с (BYN) BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи лотов №№ 1-2, **3 %** от цены продажи лотов № 3 в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.09.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **27.10.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 29 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |



ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ И ПРЕДМЕТЕ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** комитет «Минскоблимущество», тел.: (8017) 5004711, 5004710, 5168055.

**Дата и время проведения повторного аукциона: 17 ноября 2025 г. в 11.00**

**Жилое помещение: изолированное помещение** (инв. № 601/D-8553) – **квартира в блокированном жилом доме** общей площадью жилого помещения 97,1 кв. м (жилая площадь – 54,1 кв. м), 1990 г. п. (принадлежности: сарай), расположенное по адресу: Минская обл., Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 3-2. **Начальная цена предмета аукциона: 21 415,06 руб**. *(Начальная цена понижена на 80 %).*

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by.**

УНП 100104937

# КАЛАПС НА ГРАНІЦЫ

## Польскія перавозчыкі звярнуліся да ўрада Польшчы з патрабаваннем урэгуляваць крызіс на граніцы

Днямі Асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў Польшчы (ZMPD) звярнулася да ўрада з патрабаваннем урэгуляваць крызіс на граніцы з Беларуссю, піша БелТА са спасылкай на польскае выданне WNP.



### ПЕРАВОЗЧЫКІ НЯСУЦЬ ФІНАНСАВЫЯ СТРАТЫ

У звароце пазначана, што пасля трынаццацідзённага закрыцця Варшавай граніцы (нагадаем, польскі бок у аднабаковым парадку прыняў пастанову аб закрыцці граніцы ў сувязі з правядзеннем беларуска-расійскіх вучэнняў «Захад-2025») польскія перавозчыкі апынуліся «ў вельмі складанай аператыўнай, фінансавай і гуманітарнай сітуацыі».

— Рашэнне аб закрыцці граніцы было абвешчана ўсяго за два дні да яго ўступлення ў сілу, без папярэдняга аналізу эканамічных наступстваў і кансультацый з прадстаўнікамі міжнароднай транспартнай галіны. У выніку сотні польскіх грузавікоў апынуліся на беларускім баку, не маючы магчымасці вярнуцца дадому, — гаворыцца ў звароце.

Пасля адкрыцця пагранічнага пераходу ў «Казловічах» (з польскага боку — «Кукурыкі») сабралася вялізная чарга з больш чым 3 тысяч фур, якія больш за восем дзён вымушаны прастойваць у чарзе на выезд з Беларусі ў Польшчу.

У арганізацыі заклікалі ўрад Польшчы неадкладна перавесці ў пункт пропуску «Кукурыкі» з польскага боку дадатковых супрацоўнікаў, бо цяпер гэта адзіны пункт пропуску, які абслугоўвае грузавыя аўтамабільныя перавозкі паміж Польшчай і Беларуссю. Таксама распрацаваць «рашэнні для перанакіравання часткі грузаперавозак на іншыя пункты перасячэння граніцы» для аднаўлення нармальнага патоку грузаў.

— Гэтая сітуацыя пагражае не толькі цякучасці міжнародных перавозак, але і бяспецы людзей і пазіцыям польскіх кампаній на ўсходніх рынках. З-за прастою і немагчымасці выканаць кантракты польскія перавозчыкі рызыкуюць страціць заказы, якія могуць узяць на сябе кампаніі з іншых краін, — гаворыцца ў звароце.

### ПЫТАННЕ ЭКАНОМІКІ І ЧАЛАВЕЧАЙ ГОДНАСЦІ

Польскае выданне Gazeta Prawna адзначае, што чаканне мытнага афармлення часам расцягваецца да 10 дзён.

— Для перавозчыкаў кожны дзень прастою грузавіка абарочваецца стратай сумы 350 еўра, — заявіў кіраўнік Асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў (ZMPD) Ян Бучак. Доўгая чарга з грузавікоў цягнецца да граніцы, але парковачных месцаў не хапае. Паводле яго слоў, сітуацыя, якая склалася, таксама «стварае гуманітарныя праблемы».

Выданне адзначае, што чарга грузавікоў, якія чакаюць уезду ў Польшчу, ужо налічвае амаль 4 тысячы транспартных сродкаў і працягвае расці.

— Гэта не проста транспартная праблема — гэта пытанне эканомікі і чалавечай годнасці. Урад павінен дзейнічаць неадкладна, — перакананы Ян Бучак.

ZMPD таксама прапанавала тэрмінова стварыць міжведамасную крызісную групу з удзелам прадстаўнікоў урада, Краёвай адміністрацыі казначэйства і галіновых арганізацый, каб знайсці дзейсныя рашэнні і вярнуць нармальнае функцыянаванне граніцы.

У Дзяржаўным мытным камітэце Беларусі адзначалі, што работа польскіх кантралюючых службаў толькі пагаршаецца.

— Аб'ёмы прыёму польскім бокам зніжаюцца цягам усяго часу пасля пастановы Польшчы зноў аднавіць работу на польска-беларускай граніцы. Так, яшчэ 25 верасня польскія службы афармілі 680 транспартных сродкаў, праз два тыдні — амаль у два разы менш, — адзначылі днямі ў ведамстве.

### ЛЮДЗІ ЖЫВУЦЬ У ФУРАХ

Кіроўцы вялікагрузаў каля тыдня стаяць у чэргах на беларуска-польскай граніцы. Пра гэта паведамілі ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1».

Адзін з кіроўцаў грузавіка распавёў, што выезду чакае з 7 кастрычніка.

— Цяпер палякі прымаюць 400 машын, але прымалі па 600 машын за дзень (да закрыцця граніцы. — **Заўв. рэд.**), — адзначыў мужчына.

Яшчэ адзін беларускі кіроўца таксама чакае выезду ўжо больш за сем сутак.

— У Брэсцкім раёне жыву, і мне крыху лягчэй. Чым займаюцца іншыя, асабліва палякі, хто прыязджае сюды, наогул незразумела. Знаёмы жыве ўвесь гэты час у кабіне фуры. У палітыку я ўнікаць не хачу, тут у кожнага свае погляды, але неяк дамаўляцца трэба, — упэўнены ён.

Некаторыя палякі ўсе гэтыя дні застаюцца, каб перачакаць у Беларусі, а хтосьці наважваецца з'ехаць дадому праз пункт пропуску «Брэст» на легкавым аўто. Калі ж падыходзіць электронная чарга вялікагруза, даводзіцца зноў вяртацца.

Польскі кіроўца падзяліўся з журналістамі, што афармленне на беларускім баку праходзіць хутка.

— Нашы затрымліваюць. Я толькі выгружаю і еду назад, і то трэба ў чарзе чакаць. Я машыну пакідаю на паркоўцы і дадому еду легкавіком, — распавёў ён.

— Перавозчыкі стаяць, чакаюць. Польская мытня працуе лёгкімі тэмпамі. Быццам бы ўсе сядзяць на месцах, працуюць, але руху ніякага. За ўсе гады, што я працую, такога не бачыў. Для чаго сваіх жа, так скажам, перавозчыкаў караюць рублём? — не разумее адзін з кіроўцаў у чарзе.

— Да нас (у Беларусь. — **Заўв. рэд.**) мы заязджаем хутка. А ў бок Польшчы — не. Хацелася б, каб палякі лепш працавалі, пажвавей, — выказаў жаданне кіроўца фуры.

Начальнік мытнага паста «Казловічы» Іван Дземічаў адзначыў, што аб'ёмы прыёму грузавых транспартных сродкаў польскім бокам застаюцца на нізкім узроўні цягам усяго часу пасля пастановы Польшчы зноў аднавіць работу на польска-беларускай граніцы.

— У сярэднім кантралюючыя органы сумежнага боку працуюць на 25—30 % ад існуючых магчымасцяў. Тым часам чарга грузавых транспартных сродкаў на выезд з Беларусі з кожным днём павялічваецца, — дадаў ён.


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Саксэсфултрэйд Плюс»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2406 | 1. Изолированное помещение с инв. № 500/D-708141018, площадь – 20,1 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-92 | 237 500,00 | 23 750,00 | 11 875,00 |
| | 2. Изолированное помещение с инв. № 500/D-708141019, площадь – 18,1 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-93 | | | |
| | 3. Изолированное помещение с инв. № 500 D-708141020, площадь – 18,7 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-94 | | | |
| | 4. Изолированное помещение с инв. № 500 D-708141021, площадь – 17,7 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение | г. Минск, ул. Монтажников, 9-95 | | | |
| В отношении лотов проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 5 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 09.09.2025 | | | | | |
| **Ограничение (обременение):** изолированные помещения находятся в лизинговой собственности у ООО «Финансы и Механика» на основании договоров финансового лизинга по 15.07.2029 | | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **19 ноября 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 17 октября 2025 года до 16.00 17 ноября 2025 года | | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту 2406, ООО «Саксэсфултрэйд Плюс», проводимых 19.11.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр.лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

